# ТЭСТ

# 1. Бібліяграфічная служба - гэта

01. падсістэма бібліятэкі, якая забяспечвае бібліяграфічную дзейнасць

02.бібліяграфічны аддзел бібліятэкі

03. супрацоўнікі бібліятэкі, якія выконваюць бібліяграфічныя працэсы

04. сукупнасць структурных падраздзяленняў бібліятэкі, якія абслугоўваюць карыстальнікаў бібліятэкі

05. бібліёграфы, якія працуюць у бібліятэкі

# 2.Бібліяграфічная служба бібліятэкі ўключае:

01. інфармацыйныя рэсурсы, прадстаўленыя даведачнымі і бібліяграфічнымі  крыніцамі

02. суб’ектаў бібліяграфічнай дзейнасці

03. арганізацыйныя формы бібліяграфічнай дзейнасці

04. матэрыяльна-тэхнічную і эканамічную базу бібліяграфічнай дзейнасці

05. фонд бібліятэкі

# 3. Арганізацыйна-функцыянальная служба бібліятэк залежыць ад:

01. статуса бібліятэкі
02. арганізацыйнай  структуры
03. склада чытачоў
04. састава фонда
05. эканамічных рэсурсаў

## 4. Бібліяграфічная служба універсальных бібліятэк мае характар:

01. цэнтралізаваны

02. дэцэнтралізаваны

## 5. Бібліяграфічная служба ЦБС уключае:

01. бібліяграфічны аддзел ЦБ

02. аддзел абслугоўвання і інфармацыі ЦБ

03. бібліяграфічны аддзел ЦБ, небібліяграфічныя адзелы ЦБ і бібліятэкі-філіялы

04. бібліятэкі-філіялы

05. небібліяграфічныя аддзелы ЦБ

## 6. Бібліяграфічная служба абласной універсальнай навуковай бібліятэкі ўключае:

01. бібліяграфічны аддзел

02. небібліяграфічныя аддзелы бібліятэкі

03. аддзел краязнаўчай літаратуры

04. галіновыя аддзелы

05. бібліяграфічный і небібліяграфічныя аддзелы, якія выконваюць бібліяграфічныя функцыі

# 7. Асноўныя бібліяграфічныя функцыі бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі:

01. вядзенне бібліяграфічных картатэк
02. вядзенне каталогаў на ўвесь фонд бібліятэкі
03. даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў інфармацыі
04. бібліяграфічнае інфармаванне карыстальнікаў інфармацыі
05. абслугоўванне карыстальнікаў першаснымі дакументамі

## 8. Аддзел камплектавання бібліятэкі выконвае наступныя бібліяграфічныя функцыі:

01. камплектуе фонд бібліятэкі

02. выкарыстоўвае тэматычныя планы выпуска літаратуры

03. вядзе картатэкі (БД) камплектавання і дакамплектавання фонду бібліятэкі

04. фарміруе бібліяграфічную культуру карыстальнікаў інфармацыі

05.вядзе метадычную работу ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці

## 9. Аддзел краязнаўчай літаратуры выконвае наступныя бібліяграфічныя функцыі:

01. вядзе краязнаўчы ДБА
02. фарміруе фонд краязнаўчай літаратуры
03. рыхтуе краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі і БД
04. выконвае бібліяграфічныя запыты краязнаўчага зместу
05. прадстаўляе карыстальнікам першасныя дакументы краязнаўчага зместу
06. вядзе рэкламу дзейнасці краязнаўчага аддзела

# Тэма 3.

## ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АПАРАТ БІБЛІЯТЭКІ

# Пытанні:

1. Азначэнне, функцыі, уласцівасці, прынцыпы і метадычныя патрабаванні да арганізацыі ДБА
2. Структура ДБА і задачы бібліятэк па яго развіцці
3. Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі
4. Пошукавыя сродкі Інтэрнета

# 1. Азначэнне, функцыі, уласцівасці, прынцыпы і метадычныя патрабаванні да арганізацыі ДБА

# Азначэнне ДБА

ДБА – гэта даведачна-пошукавы апарат, які ўключае бібліяграфічныя дапаможнікі

ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография»

# Азначэнне ДБА

ДБА – гэта ІПС у дакументнай і/або электроннай формах, якая мае на мэце аптымізацыю пошуку бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, арыентацыю ў інфармацыйных рэсурсах

І.Р. Маргенштэрн

# Азначэнне ДБА

- Гэта сукупнасць традыцыйных і электронных даведачных і бібліяграфічных выданняў, бібліятэчных каталогаў, выкарыстоўваемых пры абслугоўванні карыстальнікаў
- ДБА – вынік працэса бібліяграфавання і сродак для абслугоўвання карыстальнікаў

# ФУНКЦЫІ ДБА

- ПОШУКАВАЯ
- КАМУНІКАТЫЎНАЯ
- АЦЭНАЧНАЯ

# ФУНКЦЫІ ДБА

Прадаставіць:

- бібліятэчную інфармацыю – звесткі аб наяўнасці і месцазнаходжанні дакумента;
- бібліяграфічную інфармацыю – звесткі аб дакуменце, неабходныя для яго ідэнтыфікацыі і выкарыстання;
- фактаграфічную інфармацыю – прывесці канкрэтныя факты, лічбы і г.д.

І.Р.Маргенштэрн

# УЛАСЦІВАСЦІ ДБА

- Сістэмнасць – ДБА складаецца з уземазвязаных элементаў, якія забяспечваюць яго цэласнасць
- Пластычнасць – здольнасць змяняцца ў залежнасці ад змены носьбітаў інфармацыі і запытаў карыстальнікаў
- Надзейнасць – здольнасць задавальняць тыповыя запыты карыстальнікаў і супрацоўнікаў
- Даступнасць – зручнасць выкарыстання
- Эканамічнасць – абмежаванасць затрат, матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў пры вядзенні ДБА

# АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ПРЫ ФАРМІРАВАННІ ДБА

- навуковы падыход пры вызначэнні складу асноўных структурных частак ДБА, кірункаў яго развіцця, абгрунтаванасці прымаемых метадычных рашэнняў і сродкаў вядзення;
- адпаведнасць структуры, аб'ёму, складу ДБА тыпу і зместу работы бібліятэкі, інфармацыйным патрэбнасцям асноўных груп карыстальнікаў;
- эканамічнасць (змяншэнне затрат на вядзенне ДБА за кошт рацыяналізацыі працы);
- дэмакратызм, даступнасць, нагляднасць, камфортнасць для спажыўцоў інфармацыі пры яго выкарыстанні.

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ФАРМІРАВАННЯ ДБА АСОБНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

- фарміравацца пастаянна і планамерна, г.зн. падаваць інфармацыю без прабелаў, максімальна поўна і шматаспектна раскрываючы фонд бібліятэкі і змест дакументаў;
- аператыўна папаўняцца новымі матэрыяламі і пазбаўляцца ад устарэлых, спрыяць аператыўнаму пошуку інфармацыі;
- прафіляваццa ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі аб ўзаемадзеянні з іншымі бібліятэкамі і органамі НТІ;

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ФАРМІРАВАННЯ ДБА АСОБНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

- захоўваць адзінства, удасканальваць свае сістэмныя якасці на падставе развіцця спецыфічных функцый складаючых яго частак і разам з тым узмацненне ўзаемадзеяння паміж імі;
- весціся паралельна як у традыцыйных формах, так і электронных;
- мець рацыянальныя суадносіны паміж вядзеннем уласнага ДБА і выкарыстаннем аддаленых інфармацыйных рэсурсаў (аддаленага ДБА).

# 2. Структура ДБА і задачы бібліятэк па яго развіцці

# Структура ДБА

- сістэма каталогаў і картатэк (баз даных);
- даведачна-бібліяграфічны фонд;
- фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў або фонд выкананых даведак (яго можна разглядаць як састаўную частку даведачна-бібліяграфічнага фонду, які ўключае неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі).

# Структура ДБА

- Уласны (лакальны) ДБА бібліятэкі
- Віртуальны ДБА - сукупнасць даведачных і бібліяграфічных крыніц, якія знаходзяцца за межамі бібілятэк і выкарыстоўваюцца ў рэжыме аддаленага доступу.

Віртуальны і электронны ДБА???

# Формы існавання частак ДБА

- Карткавая
- Друкаваная
- Электронная (лакальныя і аддаленныя он-лайнавыя) рэсурсы

# Асноўныя элементы электроннага ДБА

Лакальныя унутраныя рэсурсы:

- Электронны каталог бібліятэкі
- Бібліяграфічныя, фактаграфічныя БД, даведачныя, бібліяграфічныя крыніцы на СД-дысках

Он-лайн рэсурсы (даступныя ў Інтэрнеце знешнія рэсурсы)

Каталогі

Розныя віды (у тым ліку і бібліяграфічныя, фактаграфічныя) БД

Даведачныя рэсурсы

Навігатары па Інтэрнет-рэсурсам

# Задачы бібліятэк па развіцці ДБА

- Перавод ДБА ў электронную форму
- Фарміраванне лакальнай бібліятэчнай сеткі
- Прадстаўленне ўласных электронных інфармацыйных рэсурсаў у Інтэрнеце
- Удзел у карпаратыўных праектах па фарміраванні аб'яднаных бібліяграфічных рэсурсаў (зводных ЭК, БД, размеркаваных рэсурсаў з адзінай кропкай доступу)
- Каталагізацыя Інтэрнет-рэсурсаў і стварэнне навігатараў па Інтэрнет-рэсурсам

# 3. Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі

# Азначэнні каталога і картатэкі

- бібліяграфічны каталог – гэта бібліяграфічны дапаможнік, які раскрывае склад і (або) змест фондаў дакументаў (бібліятэк, кнігагандлёвых установаў)
- бібліяграфічная картатэка – гэта бібліяграфічны дапаможнік, рэалізаваны ў карткавай форме і не звязаны жорстка з пэўным фондам дакументаў

ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография.
Термины и определения”

# Адрозненні:

- Форма існавання
- Сувязь з фондам
- Віды бібліяграфіруемых дакументаў

# ЗАДАЧЫ:

- адлюстраваць на другасным узроўні фонд бібліятэкі;
- раскрыць па магчымасці поўна і шматаспектна змест канкрэтных выданняў;
- інфармаваць аб рэсурсах, да якіх бібліятэка мае доступ з дапамогай выкарыстання тэлекамунікацыйных сродкаў сувязі.

# Неабходны набор каталогаў і картатэк вызначаецца:

- Фондам бібліятэкі
- Структурай бібліятэкі
- Асаблівасцямі інфармацыйных патрэбнасцей асноўных груп карыстальнікаў
- Спецыялізацыяй і  традыцыямі бібліятэкі
- Наяўнасцю іншых бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў у рэгіёне

# Паняцце «самастойны каталог/картатэка» як крытэрый пазбегнуць дубліравання

- адлюстраванне пэўных відаў дакументаў
- пэўны спосаб групоўкі
- змястоўныя межы
- тыповыя пошукавыя сітуацыі

# Агульныя прынцыпы фарміравання сістэмы каталогаў і картатэк

- цэласнасць
- адзінства

# Цэласнасць і адзінства забяспечваецца:

- выкарыстаннем адзінай або сумяшчальнымі інфармацыйна-пошукавымі мовамі;
- стандартызаванымі формамі, фарматамі бібліяграфічных запісаў;
- комплексам адзіных праграмных і тэхнічных сродкаў падрыхтоўкі, захоўвання і выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі;
- агульнымі дапаможнымі пошукавымі сістэмамі (у традыцыйным варыянце – гэта адзіны алфавітна-прадметны паказальнік);

# Цэласнасць і адзінства забяспечваецца:

- адзінымі сістэмамі інфармавання аб складзе і асаблівасцях сістэмы каталогаў і картатэк у дадзенай бібліятэцы;
- перакрыжаванай сістэмай спасылак і адсылак унутры сістэмы каталогаў і картатэк;
- класіфікацыйнымі індэксамі і шыфрамі захоўвання на фонд бібліятэкі, якія пераносяцца ў найбольш актыўна выкарыстоўваемыя картатэкі і бібліяграфічныя дапаможнікі.

# КАТАЛОГІ БІБЛІЯТЭК

- Гл. курс “Каталагізацыя дакументаў”

# Распаўсюджаныя картатэкі бібліятэк:

Па зместу адлюстройваемых дакументаў

- сістэматычная картатэка артыкулаў (СКА);
- краязнаўчыя картатэкі;
- тэматычныя картатэкі;

Па відах бібліяграфіруемых дакументаў і ў адпаведнасці з пэўнымі тыпамі запытаў

- спецыяльныя картатэкі;

Па характару прадстаўляемай інфармацыі

- бібліяграфічныя картатэкі
- фактаграфічныя картатэкі.

# Спецыяльныя картатэкі

- Картатэка загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры
- Картатэка персаналій
- Картатэка рэцэнзій
- Картатэка бібліяграфічных дапаможнікаў
- Картатэка прац супрацоўнікаў УВА, НДУ
- Картатэка дысертацый і інш.

# Фактаграфічныя картатэкі

- Картатэка сацыяльна-эканамічнага профілю рэгіёна
- Картатэка арганізацый пэўнага профілю, рэгіёна
- Картатэкі «Беларускія алімпійцы», «Беларускія параалімпійцы»

# Картатэкі

Базы дадзеных

# Віды БД

- Бібліяграфічныя
- Рэфератыўныя
- Аб'ектаграфічныя
- Фактаграфічныя

# Бібліяграфічныя БД

- БД «Артыкулы» («Аналітыка»)
- Галіновыя, тэматычныя, рэспубліказнаўчыя, краязнаўчыя БД (БД «Беларусь: ад мінулага да сучаснасці» НББ; «Экалогія і прыродавыкарыстанне ў Беларусі» ЦНБ; БД «Государство і право» ПрБ; «БД «Краязнаўства» і інш.;
- БД прац супрацоўнікаў УВА

# Фактаграфічныя БД

- Нацыянальная БД аўтарытэтных/нарматыўных запісаў
- БД «Вучоныя Беларусі» (НББ)
- БД «Беларусь у асобах і падзеях» (НББ)
- БД «Бібліятэкі Рэспублікі Беларусі і замежных краін» (НББ)
- БД «Беларуская навука ў асобах»,«Біяграфістыка» (ЦНБ НАН РБ)
- БД «Беларускія алімпійцы», «Параалімпійцы» (Б-ка БДУФС)
- БД «Хроніка культурных падзей вобласці»
- БД «Памяць Міншчыны» і інш.

# Беларусь у асобах і падзеях

http://wcent.nlb.by/factualdbtest/view/faces/Main.jspx



# У раздзеле «Персаналіі» прадстаўлены звесткі аб:

- гістарычных асобах, якія ўнеслі значны ўклад у развіцце Беларусі і іншых краін
- прадстаўніках знакамітых родаў
- грамадска-палітычных, ваенных дзеячах, дзеячах навукі, тэхнікі, эканомікі, а таксама культуры, мастацтва і літаратуры, спорта і рэлігіі

Каля 17 тыс. фактаграфічных

запісаў

# У раздзеле «Падзеі» прадстаўлены звесткі аб:

- падзеях у эканамічнай, грамадска-палітычнай, ваеннай, культурнай і іншых сферах жыцця Беларусі
- установах, арганізацыях, прадпрыемствах
- прыродаахоўных тэрыторыях
- прафесійных творчых калектывах
- перыядычных выданнях
- мемарыяльных комплексах і памятніках гісторыі і культуры
- адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках
- аб'ектах, якія з'яўляюцца адметнымі ў сваім роддзе

Каля 8 тыс. фактаграфічных запісаў

# Выяўленне і актуалізацыя фактаграфічнай інфармацыі ў БД вядзецца па:

Даведачныя выданні




Перыядычныя выданні




**А таксама:**

- бягучыя паступленні дакументаў у фрнд НББ
- штомесячны бібліяграфічны бюлетэнь “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”
- матэрыялы, што прадстаўляюцца інфармацыйнымі партнерамі бібліятэкі
- аўтарытэтныя інтэрнэт-рэсурсы

# БД «Бібліятэкі Рэспублікі Беларусі і замежных краін» (НББ)



# БД «Бібліятэкі Рэспублікі Беларусі і замежных краін» (НББ)

Структура фактаграфічнага запісу:

- Назва бібліятэкі
- Ведамасная і відавая прыналежнасць
- Структура
- Адрас і іншая кантактная інфармацыя, рэжым працы
- Звесткі аб інфармацыйных рэсурсах (раздзел «Электронныя інфармацыйныя рэсурсы)
- Звесткі аб персаналях (кіраўнікі бібліятэк і структурных падраздзяленняў і інш.)

Забяспечваецца зручны і шматаспектны пошук па розных палях БД.

# Арганізацыйна-фірменная картатэка: макет апісання

- Назва арганізацыі
- Адрасныя даныя
- Тып арганізацыі і форма ўласнасці
- Звесткі аб першых асобах
- Асноўныя кірункі дзейнасці
- Прадукцыя, паслугі і ўмовы прадстаўлення
- Рэйтынг арганізацыі
- Членства ў міжнародных прафесійных аб’яднаннях
- Адлюстраванне дзейнасці арганізацыі ў друку
- Выданні самой арганізацыі

# Тэндэнцыі развіцця электроннага ДБА

- Бібліятэкі займаюцца стварэннем уласных (ЭК, краязнаўчыя БД, БД на асобныя віды дакументаў і інш.) і набыццём знешніх БД;
- З пашырэннем асартымента інфармацыйных прадуктаў на інфармацыйным рынку бібліятэкі адмовіліся ад стварэння шэрагу ўласных БД, у т.л. прававых, тэматычных БД;
- Набываемыя БД дазваляюць бібліятэкам не толькі выправіць інфармацыйныя прабелы ў складзе ДБА, але і палепшыць якасць абслугоўвання;
- Фарміраванне лакальнай  падсістэмы электронных рэсурсаў для бібліятэкі – працаёмкі працэс. Перспектыўным напрамкам з’яўляецца эксплуатацыя аддаленых электронных рэсурсаў.

# 4. Пошукавыя сістэмы ў Інтэрнеце

- каталогі інтэрнэт-рэсурсаў
- пошукавыя сістэмы
- мэтапошукавыя сістэмы
- парталы

# Пытанні для абмеркавання

1. Што адносіцца да абавязковых элементаў ДБА?
2. Назавіце перавагі ЭК над карткавым.
3. Што такое аўтарытэтныя файлы? У чым іх перавагі для карыстальніка?
4. Чым забяспечваецца даступнасць ДБА для карыстальніка?
5. Якія метады кіравання выкарыстоўваюцца пры вядзенні ДБА?

# Дзякуй за ўвагу!